№ 12 (881)
Сакавік 2022 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

kazeta.by bfk.by

# Летапісец беларускай даўніны




***Далёка не ў кожнага беларускага горада ёсць свой «летапісец», які прысвяціў даследаванню яго гісторыі ўсё сваё жыццё. Але Віцебску пашанцавала. Вельмі шмат для вывучэння мінулага нашага старажытнага горада зрабіў выбітны беларускі гісторык, краязнаўца, археограф, выкладчык, грамадскі дзеяч Аляксей Сапуноў (1852 – 1924). 15 сакавіка, у дзень, калі споўнілася 170 гадоў з дня яго нараджэння, у Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава «Руплівец беларускай даўніны».***



Аляксей Сапуноў

Гэты праект падрыхтаваны сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і прысвечаны кніжнай спадчыне А. Сапунова. Ён аб'ядноўвае два зборы: матэрыялы асабістага архіва вучонага з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і яго кнігазбор з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

На адкрыцці выставы прысутнічалі прадстаўнікі віцебскай грамадскасці, студэнты гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, навукоўцы, ганаровым госцем была аўтар кнігі пра А. Сапунова «Гісторык з Віцебска» Людміла Хмяльніцкая. Выступілі намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Валерый Шышанаў, вядомы віцебскі краязнаўца Мікола Півавар, культуролаг і кнігазнаўца Алесь Суша і інш. М. Півавар адзначыў, што прыклад краязнаўца А. Сапунова з'яўляецца сёння вельмі важным для моладзі, для тых, хто хоча пазнаваць і вывучаць родны край. Супрацоўніца музея Н. Варламава правяла для гасцей экскурсію па выставе і распавяла пра жыццёвы шлях і дзейнасць А. Сапунова.

Аляксей Парфёнавіч – ураджэнец Віцебшчыны, адзін з самых захопленых і карпатлівых даследчыкаў роднага краю. Ім напісана каля 50-і кніг і брашур, а таксама дзясяткі навуковых артыкулаў і нарысаў па гісторыі, этнаграфіі, археаграфіі Віцебскага Падзвіння. Навуковец упершыню выявіў, сабраў, пераклаў і выдаў вялікі пласт першакрыніц па гісторыі краю. Найбольш вядомымі выданнямі з'яўляюцца кнігі «Витебская старина» і «Река Западная Двина».

А. Сапуноў нарадзіўся 15 сакавіка 1852 г. у мястэчку Усвяты Суражскага павета Віцебскай губерні ў сям'і небагатага купца і сялянкі. У 1862 г. бацька адвёз Аляксея па навуку ў губернскі Віцебск у мясцовую Аляксандраўскую гімназію. У 1869 г. А. Сапуноў паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. Па заканчэнні вучобы вярнуўся ў Віцебскую гімназію і пачаў выкладаць старажытныя мовы, адначасова займаўся вывучэннем і зборам гістарычных дакументаў.

Першая яго публікацыя, прысвечаная гісторыі горада, з'явілася ў 1881 г. А першы том зборніка дакументаў «Витебской старины» выйшаў з друку ў 1883 г. Яго адметнай асаблівасцю была вялікая колькасць уведзеных аўтарам у тэкст ілюстрацый – факсіміле асобных дакументаў, пячатак, гравіраваныя партрэты гістарычных асобаў, малюнкі помнікаў архітэктуры, планы і карты. Першы том «Витебская старина» напаткаў вялікі поспех. Гэтая праца была заўважана ў буйных навуковых цэнтрах Расійскай імперыі. А. Сапуноў склаў план стварэння серыі з пяці тамоў.

Аляксей Парфёнавіч быў абраны правадзейным членам Рускага геаграфічнага таварыства, членам Гістарычнага таварыства пры Санкт-Пецярбургскім універсітэце, Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта, Смаленскай вучонай архіўнай камісіі, Таварыства вывучэння Магілёўскай губерні, Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве і іншых устаноў.

«А.П. Сапуноў у галіне даследавання Віцебшчыны пакінуў значную спадчыну, таму яго імя будзе бессмяротным сярод вучоных Беларусі, – адзначаў М. Багародзіцкі ў 1925 г. – Усе працы Аляксея Парфёнавіча мнагабочны па закранутым тэмам і характэрызуюць Віцебшчыну з усіх бакоў. Імі прыходзіцца карыстацца і археолагам, і географам, і натуралістам. Можна толькі здзіўляцца, як мог прарабіць такую тытанічную працу адзін чалавек, выключна забяспечаны мізерным заробкам настаўніка правінцыйнай гімназіі, які правёў большую частку свайго працоўнага жыцця сярод правінцыяльнай штодзённасці».

У рамках выставы жыхары і госці Віцебска змогуць не толькі пазнаёміцца з кніжнай спадчынай А. Сапунова, але і ўпершыню ўбачыць кнігі з яго асабістай бібліятэкі, што былі набыты Беларускай дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэкай (сучасная Нацыянальная бібліятэка Беларусі) у 1923 г. Тут прадстаўлены 47 экзэмпляраў з яго кніжнай калекцыі, сярод якіх друкаваныя выданні гісторыка і выданні з уладальніцкім надпісам, дароўнымі надпісамі А. Сапунова ці да яго. Выданні адзначаны характэрным подпісам уладальніка або адмысловай рэльефнай пячаткай.

Віцебскі абласны краязнаўчы музей прэзентуе больш за 200 унікальных дакументаў з асабістага архіва А. Сапунова, звязаных з выдавецкай, выкладчыцкай, навуковай і грамадскай дзейнасцю вучонага. Увазе наведвальнікаў прадстаўлены дакументы і рукапісы па гісторыі Віцебска, Полацка, іншых гарадоў былой Віцебскай губерні, матэрыялы па гісторыі праваслаўнай царквы, па гісторыі Прыбалтыкі, курсы лекцый для навучальных устаноў, літаграфіі да розных выданняў А. Сапунова.

Сапраўднымі рарытэтамі з'яўляюцца «Кніга прывілеяў Віцебска», рукапіс «Гісторыя Віцебска», а таксама асабісты альбом А. Сапунова. Упершыню на выставе прадстаўлены клішэ са збору Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта, што выкарыстоўваліся ў публікацыях А. Сапунова.

Выстава будзе працаваць да 31 мая.

*Эла ДЗВІНСКАЯ*

## *У дзячнасць дабрадзеям*

Няпростае фінансавае становішча Беларускага фонду культуры і «Краязнаўчай газеты», якую выдае фонд, змушае нас час ад часу звяртацца да сяброў, калег і проста неабыякавых асоб з просьбамі аб матэрыяльнай дапамозе. Фонд культуры з удзячнасцю прымае ахвяраванні, што ідуць у асноўным на пагашэнне запазычанасці за арэнду памяшкання.

Мы шчыра ўдзячныя тым, хто адгукнуўся цягам лютага-сакавіка. Гэта нашы сябры (выбачайце, прозвішчы ды імёны падаем так, як яны да нас прыходзяць):

Сотнікаў Аляксандр Яўгенавіч,
Аглушэвіч К.Л.

Для тых жа, хто таксама хацеў бы дапамагчы Беларускаму фонду культуры, падаем варыянты, як гэта можна зрабіць.

*Па-першае, грошы можна пералічыць (з пазнакаю «Ахвяраванне») у любым банку на рахунак БФК.*

**Толькі – УВАГА!**

У Беларускага фонду культуры **з 25 сакавіка 2022 г. мяняюцца банкаўскія рэквізіты**. Цяпер дабрачынны рахунак такі:

BY50 TECN 3135 5612 8000 0000 0010, г. Минск, ОАО «Технобанк», код банка TECNBY22, наш УНП 100081886 (ахвяраванне або падтрымка «Краязнаўчай газеты»).

Грошы можна пералічыць *і праз АРІП*. Для гэтага трэба:

1. Выбраць:
Пункт «Система “Расчёт”» (ЕРИП)
Благотворительность, общественные объединения
Просветительские, культурно-досуговые
Белорусский фонд культуры
Пожертвование
2. Выбраць паслугу, што аплачваецца: Пожертвование.
3. Для аплаты паслугі Пожертвование ўвядзіце свае прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Праверыць карэктнасць інфармацыі.
5. Ажыццявіць плацёж.

Калі Вы ажыццяўляеце плацёж у касе банка, калі ласка, паведаміце касіру аб неабходнасці правядзення плацяжу праз сістэму «Расчёт» (ЕРИП).

*Выканкам Беларускага фонду культуры, рэдакцыя «Краязнаўчай газеты»*




# Як касцёл Антонія Падуанскага ў Віцебску ўразіў Івана Буніна

***Сапраўднай перлінай ратушнай плошчы ў Віцебску быў касцёл святога Антонія Падуанскага. Многія госці горада захапляліся яго велічнай прыгажосцю. Адным з іх быў і знакаміты рускі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры 1933 года Іван Бунін.***

У 1899 годзе, на той час яшчэ малады пісьменнік, І. Бунін наведаў Віцебск і адзначыў: *«…я шёл как очарованный в этой толпе, в этом столь древнем, как мне казалось, городе, во всей его чудной новизне для меня»*.

Будучага нобелеўскага лаўрэата надзвычай уразіла арганная музыка ў касцёле Антонія Падуанскага. Гэтым уражаннем ён падзяліўся ў вершы «Костёл», напісаным неўзабаве пасля візіту ў Віцебск. Але найбольш яскрава І. Бунін перадаў яго ў сваім аўтабіяграфічным творы «Жизнь Арсеньева», завершаным праз 30 гадоў пасля наведвання Віцебска: *«Ни Акрополь, ни Баальбек, ни Фивы, ни Пестум, ни святая София, ни старые церкви в русских кремлях и доныне несравнимы для меня с готическими соборами. Как потряс меня орган, когда я впервые (в юношеские годы) вошёл в костёл, хотя это был всего-навсего костёл в Витебске! Мне показалось тогда, что нет на земле более дивных звуков, чем эти грозные, скрежещущие раскаты, гул и громы, среди которых и наперекор которым вопиют и ликуют в разверстых небесах ангельские гласы…»*.

Касцёл Антонія Падуанскага разам з кляштарам бернардзінцаў быў фундаваны віцебскім ваяводам Янам Антоніем Храпавіцкім ў 1676 годзе. Першы, драўляны, будынак узвялі ў 1685 годзе. У 1737-м пачалося будаўніцтва мураванага касцёла і кляштара на сродкі Казіміра і Тэклі (з Ларскіх) Саковічаў. У 1768 годзе касцёл быў асвечаны ў імя св. Антонія Падуанскага.

У 1832 годзе кляштар бернардзінцаў быў скасаваны, а ў 1843-м касцёл стаў парафіяльным і дзейнічаў да 1920-х гадоў, калі яго закрылі. Некалькі гадоў у яго будынку працаваў «Музей атэізму», дзе захоўваліся мошчы Ефрасінні Полацкай. Будынак касцёла пацярпеў у гады Другой сусветнай вайны і быў канчаткова зруйнаваны ў 1961 годзе.

*Павел КАРАЛЁЎ*

## На тым тыдні…

### *Ратуемся спадчынай*

✓**16 сакавіка** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Шэсць стагоддзяў гісторыі медыцыны і фармацыі ў рарытэтах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі»**, прымеркаваная да 100-годдзя ўтварэння РУП «Белфармацыя». У экспазіцыі прадстаўлены выданні, што распавядаюць аб багатай гісторыі зараджэння і развіцця медыцыны і аптэчнай справы ў Беларусі. Яны размеркаваны па раздзелах «Медыцына», «Аптэчная справа», «Вучэнне аб леках», «Лекавыя расліны». Адным з самых старажытных экспанатаў выставы з'яўляецца «Гербарый», які надрукаваў Петэр Шофер у Майнцы ў 1484 г. У кнізе апісаны і праілюстраваны 150 раслін. Гравюры (на дрэве) расфарбаваны ад рукі зялёным, жоўтым, чырвоным і сінім колерамі. Асабліва значным выданнем па медыцыне з'яўляецца «Салернскі кодэкс здароўя». У ім аўтар, іспанскі медык і алхімік Арнольд з Вілановы, прадставіў у вершах медыцынскае крэда Салернскай школы ў галіне правільнага харчавання і прадухілення захворванняў. Вялікую цікавасць для наведвальнікаў уяўляюць кнігі, што адлюстроўваюць развіццё аптэчнай справы ў розныя гістарычныя перыяды. Выданні раскрываюць медыцынскае і аптэчнае мастацтва, накіраванае на захаванне здароўя людзей.

Выстава будзе працаваць да 30 красавіка.

✓З **16 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» працуе выстава **«Лабірынты гуку»** вядомага беларускага музыканта і мастака Івана Кірчука. На ёй прадстаўлены больш за 40 графічных работ, выкананых у чорна-белай гаме. Сабраныя творы мастака ахопліваюць 40 гадоў яго жыцця, у якім былі шматлікія падарожжы, міжнародныя фестывалі і мноства дарог. Пад час сваіх падарожжаў ён рэгулярна рабіў накіды, якія пасля ўвасабляліся ў творы мастацтва. Усе перажытыя моманты яго жыцця складаліся ў мноства гатэльных гукаў, якія ўпісаліся ў яго сэрца шматлікімі лабірынтамі – часоў, краін, пахаў і ўражанняў. У працах Івана Кірчука гукі застылі ў прасторах і ўпалі лініямі на паперу.

Выстава працягнецца да 2 красавіка.

✓**17 сакавіка** ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва» адкрылася персанальная выстава гродзенскага мастака-манументаліста Сяргея Грыневіча **«Дэмаграфія»**. Увазе гледача прадстаўлены манументальныя жывапісныя палотны, якія ўражваюць новым поглядам на актуальныя праблемы эпохі і культурна-гістарычныя працэсы. *«Для мяне праца над карцінамі з'яўляецца таксама суб'ектыўнай спробай паразважаць над паняццямі дабра і зла, спробай адшукаць візуальны код іх узаемапранікнення, намацаць часам няўлоўную мяжу паміж імі»*, – гаворыць мастак пра сваю творчасць. *«Заставацца шчырым самім з сабой у мастацтве. Я і да сябе гэта адношу. Кампрамісы з сумленнем каштуюць вельмі дорага»*, – перакананы ён.

Выстава працуе па 3 красавіка.

✓**17 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы пачаў працу выставачны праект **«Ад шчырага сэрца»**, прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і прымеркаваны да Міжнароднага дня паэзіі. Назву падказалі дароўныя надпісы Янкі Купалы Антону Луцкевічу, Сяргею Палуяну, Уладзіміру Дубоўку, «мілым Глебкам», Міхаілу Грамыку, Барысу Емяльянаву. Ад шчырага сэрца дарыў паэт сябрам свае кнігі, фатаграфіі. Кароткія аўтографы захавалі для нас цеплыню сустрэч, успаміны аб доўгім знаёмстве, сумеснай працы, сяброўстве. За кожным – свая гісторыя, якая адкрывае нам унутраны свет пісьменніка, уводзіць у кола яго сяброў. У падборцы кніг і фатаграфій – аўтографы Янкі Купалы, яго жонкі Уладзіславы Луцэвіч, стваральніцы і першага дырэктара літаратурнага музея паэта, дароўныя надпісы паэтаў і перакладчыкаў Купалавых твораў – ад пачатку XX ст. да нашых дзён. На выставе прадстаўлены аўтографы Кандрата Крапівы, Петруся Броўкі, Сяргея Грахоўскага, Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Івана Мележа, Івана Навуменкі, Уладзіміра Караткевіча і многіх іншых, якія захоўваюцца ў прыватных зборах. Многія з іх экспануюцца ўпершыню.




Выстава доўжыцца па 23 красавіка.

✓З **18 сакавіка** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі пачала працу сталая экспазіцыя **«Ратуша – цэнтр Віцебска»**. Яна размясцілася на першым узроўні вежы. У экспазіцыі з дапамогай візуальных і мультымедыйных сродкаў распавядаецца пра гісторыю горада, ратушы, ратушнай плошчы, архітэктуры цэнтра Віцебска. Тут прадстаўлены копія прывілея на магдэбургскае права, выдадзенага Віцебску каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам Вазам, іншыя дакументы, якія вызначылі гісторыю горада.

✓**18 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прэзентавалі факсімільнае выданне паэтычнага зборніка Якуба Коласа **«Водгулле»**. Гэта другі зборнік вершаў паэта пасля «Песняў жальбы» і першы, які выйшаў пасля яго вяртання ў Беларусь у 1921 г. У ім сабраныя вершы, напісаныя не толькі пад час Першай сусветнай вайны, а значна большага перыяду. У яго ўвайшлі вершы 1908 – 1921 гг. Тэматыка паэтычных твораў розная: ад пейзажных і натурфіласофскіх вершаў да вершаў грамадзянскага гучання, звязаных з палітычнымі і сацыяльнымі падзеямі таго часу. Якуб Колас таксама закрануў астрожную і рэвалюцыйную тэматыку, у якіх праяўляецца страх і няўпэўненасць аўтара ў будучыні, гучыць трывога паэта за лёс Беларусі ў новых гістарычных умовах. Зборнікам «Водгулле» Якуб Колас паказаў жыццё ва ўсёй яго шматграннасці і супярэчлівасці. Усе праявы рэчаіснасці – сумныя і радасныя, змрочныя і светлыя – сталі прадметам яго паэтычнага адлюстравання. Тым не менш, паэтычны зборнік, на жаль, не атрымаў заслужанай увагі. Гэта абумоўлена рознымі фактарамі і абставінамі, хоць вершы, сабраныя ў ім, сведчаць пра творчае развіццё паэта. Важна адзначыць, што на той час было рознае стаўленне да паэтычных твораў гэтага зборніка: ад моцнай крытыкі да ўхвальных выказванняў. Сімвалічна, што факсімільнае выданне «Водгулле», прымеркаванае да 100-годдзя яго выхаду ў друк, прэзентуецца ў юбілейны год з часу нараджэння Якуба Коласа. Гэтае выданне зможа больш глыбока пазнаёміць з ранняй творчасцю паэта і паказаць шырокую палітру вобразаў і тэмаў, адлюстраваных у яго вершах, а таксама багацце і сакавітасць беларускай мовы. У прэзентацыі ўзялі ўдзел даследчыкі творчасці Якуба Коласа, а таксама родныя Песняра, прагучалі вершы са зборніка «Водгулле».




*Скарыстаная інфармацыя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва», Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.*

# На варце гістарычнай памяці

***Сёлета адзначаецца 100-годдзе Беларускага дзяржаўнага музея, які ў 1920 – 1930-я гады быў галоўнай музейнай установай Беларусі. Менавіта ад яго вядзе сваю гісторыю Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Аднак заснаваны БДМ быў не на пустым месцы. Яго стварэнню папярэднічала самаадданая і карпатлівая праца мінскіх гісторыкаў і краязнаўцаў.***



*Будынак архірэйскага падвор'я, у якім знаходзіўся Мінскі царкоўна-археалагічны музей. Фота пачатку XX ст.*

## Мінскі царкоўна-археалагічны музей

Сярод устаноў, якія збіралі ў беларускіх губернскіх гарадах царкоўныя старажытнасці, важнае месца належала музею Мінскага царкоўна-археалагічнага камітэта, што ўзнік у пачатку 1908 г. Ініцыятыва яго стварэння зыходзіла ад групы гарадской інтэлігенцыі, якая займалася вывучэннем краю, – А. Сніткі, Д. Скрынчанкі, Н. Былова, А. Смародскага, А. Юрашкевіча. Карыстаючыся прыкладам ужо існуючых на той час музеяў у Віцебску і Магілёве, сябры камітэта звярнуліся па фінансавую падтрымку да праваслаўнай царквы. Вядома, што гэтаму звароту папярэднічалі безвыніковыя спробы гісторыка і краязнаўцы А. Сніткі атрымаць ад гарадскіх улад дазвол на адкрыццё «Беларускага музея» ў Мінску.

Паводле статута камітэт меў шырокае кола задач: вывучэнне царкоўнай гісторыі, помнікаў матэрыяльнай культуры, вывучэнне народных звычаяў, збіральніцтва казак і спеваў. Камітэт абавязваўся браць на ўлік старажытныя цэрквы, могілкі і іншыя помнікі, папярэджваць іх знішчэнне, а таксама распаўсюджваць у грамадстве гістарычныя веды, абуджаць цікавасць да мінулага пры дапамозе выстаў і публічных чытанняў. Статут прадугледжваў захаванне і экспанаванне ў музеі прадметаў мясцовай археалогіі, побыту і рамёстваў, царкоўнага і свецкага мастацтва, нумізматыкі. Старадрукі і рукапісы павінны былі захоўвацца ў спецыяльна створаным пры музеі архіве. Уся інфармацыя аб прадметах заносілася ў спецыяльны вопіс, а ў перспектыве меркавалася публікацыя каталогаў калекцый.

У 1909 г. пачалі друкавацца «Працы» камітэта, усяго было выдадзена чатыры выпускі, якія змяшчалі багаты краязнаўчы матэрыял. У гэты ж час пад рэдакцыяй А. Сніткі выйшаў каталог найбольш каштоўных калекцый музея – старадрукаў і рукапісаў. Паводле яго, музей валодаў дакументамі вялікага архіва Слуцкага Троіцкага манастыра, у тым ліку «Апосталам» XVIII ст., «Мінеяй месячнай» 1521 г., статутамі сярэдневяковых беларускіх цэхаў і інш.

Для экспазіцыі адвялі два пакоі архірэйскага дома. Наведвальнікаў музей прымаў па панядзелках. Сябры камітэта, якія дзяжурылі ў гэтыя дні, давалі тлумачэнні наведвальнікам пад час агляду экспазіцыі, чыталі лекцыі па гісторыі.

На працягу некалькіх гадоў колькасць сяброў Мінскага царкоўна-археалагічнага камітэта павялічылася да 40. Яны па-ранейшаму збіралі старажытныя рукапісы, інфармацыю пра народныя звычаі і абрады, запісвалі песні, публікавалі вынікі сваёй дзейнасці ў «Працах» камітэта. Праводзіліся і гістарычныя даследаванні Мінскай губерні, у прыватнасці, раёна пераправы войск Напалеона праз Бярэзіну, дзе былі зроблены цікавыя знаходкі. Актыўна вялася праца па ахове гістарычных помнікаў. Кіраўніцтву мінскіх навучальных устаноў прапаноўвалася накіроўваць вучняў па нядзелях у музей. У перыядычным друку з'яўляліся артыкулы сяброў камітэта аб неабходнасці захавання гістарычнай спадчыны. Святары атрымлівалі апытальныя лісты з мэтай пошуку новых экспанатаў. А ў 1913 г. епіскап Мінскі і Тураўскі Мітрафан выдаў загад, які ўводзіў адказнасць духавенства за псаванне царкоўных старажытнасцяў і ўтрымліваў элементарныя правілы іх рэстаўрацыі. Аднак развіццю музея перашкодзіла Першая сусветная вайна. Яго лепшыя калекцыі былі эвакуяваны ў Разань.



*У. Дзмітрыеў*

## Абласны музей

Неўзабаве пасля абвяшчэння БССР, 27 сакавіка 1919 г. Наркамасветы рэспублікі прыняў рашэнне аб утварэнні на аснове нацыяналізаваных культурных каштоўнасцяў Абласнога музея ў Мінску. Для яго быў адведзены будынак былога Дваранскага сходу, скляпенні якога пераабсталявалі пад музейныя сховішчы. Загадчыкам музея прызначылі расійскага мастацтвазнаўцу У. Дзмітрыева, які адначасова выконваў функцыі загадчыка мастацка-археалагічнага пададдзела, захавальнікам – мінскага антыквара Л. Замкова. Менавіта У. Дзмітрыеў, прыхільнік мастакоў-авангардыстаў, упершыню сфармуляваў асноўныя погляды новай улады на музейную справу. Сярод іх варта звярнуць увагу на некалькі пазіцый: стаўленне да музейных каштоўнасцяў як да агульнага набытку, адмаўленне ў праве валодання імі прыватнымі асобамі, утылітарны погляд на гісторыка-культурныя помнікі. Гэтыя погляды неўзабаве ўвасобіліся ў экспазіцыі Абласнога музея, якая сумяшчала інтэр'ерны і калекцыйны спосабы паказу жывапісу, дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, прадметаў матэрыяльнай культуры. Далейшае развіццё Абласнога музея перапынілася акупацыяй горада польскімі войскамі, якія перад адступленнем вывезлі найбольш каштоўныя экспанаты ў Варшаву.

Пасля другога абвяшчэння БССР у 1920 г. беларускі ўрад прыняў рашэнне аднавіць Абласны музей, у якім заставалася каля 1 тыс. прадметаў мастацтва і каля 2 тыс. адзінак нумізматыкі. З гэтай мэтай у складзе Наркамасветы БССР была створана Музейная камісія (Галоўмузей) на чале з нумізматам П. Харламповічам. Змены ў дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы, курс на беларусізацыю паскорылі тэмпы аднаўлення музея, які разглядаўся як адзін з важнейшых нацыянальна-культурных сімвалаў рэспублікі. Гэтая праца ішла ўжо ў іншым памяшканні – у будынку архірэйскага дома. У 1921 – 1922 гг. тут праводзіліся інтэнсіўныя збор і інвентарызацыя калекцый. Сярод найбуйнейшых паступленняў таго часу была калекцыя тканін, вопраткі і замалёвак, якую сабрала экспедыцыя Наркамасветы ў Слуцкім павеце. Фонды музея ўзбагацілі рукапісныя кнігі, нумізматычны збор, культавыя рэчы былога мінскага царкоўна-археалагічнага музея, рээвакуяваныя з Разані. Мінскае таварыства гісторыі і старасвеччыны перадало музею матэрыялы археалагічных раскопак у Заслаў'і і рэшткі калекцый былога Мінскага гарадскога музея.

На аднаўленне музея звярнулі ўвагу вышэйшыя дзяржаўныя ўстановы БССР: ЦВК ахвяраваў калекцыю старажытных манет, СНК – калекцыю акварэляў XIX ст., наркамат земляробства – карціны і старадаўнюю зброю. З Галоўнага музейнага фонду РСФСР была перададзена невялікая калекцыя фарфору і прадметаў выяўленчага мастацтва. Шэраг каштоўных прадметаў быў ахвяраваны ў музей прыватнымі асобамі. Так, адзін з найбольш каштоўных падарункаў зрабіў супрацоўнік Цэнтрархіва БССР І. Барашка, які адшукаў рэшткі мінскай выставы 1918 г., наладжанай І. Луцкевічам і А. Іпелем. У 1922 г. саспела ідэя стварэння Беларускага дзяржаўнага музея. Пра што мы раскажам у наступных нумарах «Краязнаўчай газеты».

*Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ.*





*Залы Мінскага царкоўна-археалагічнага музея. Фота пачатку XX ст.*

# Тапаніміка Загор'я Дзяляціцкага

***У ранейшыя часы кожная беларуская вёска мела свае назвы лугоў, сенажацяў, азёр, рэчак, узгоркаў, размешчаных недалёка ад яе. Але сёння пакрысе гэтыя назвы, іх паходжанне і значэнне пачалі забывацца. Каб не згубілася памяць аб назвах маёй вёскі Загор'е Дзяляціцкае, я вырашыў іх занатаваць і пазначыць на сучаснай мапе.***

А назваў такіх шмат: Раманаўкі, Хотні, Пылаўкі, Тушава, Хвойнік, Селішча, Катловішчы, Бажніца, Балонне, Асовыя, Занямонне, Пасека, Войнава, Выгода, Касаванка, Загуменне, Пярэкале, Алешнік, Студзянец. Па назвах гэтых мясцін калісьці было лёгка вызначыць, дзе знайсці чалавека ці прапалую жывёліну. Усе яны знаходзяцца на невялікай адлегласці адна ад адной, таму, гучна крыкнуўшы, можна было разбудзіць прыснулага пастуха. Жыхары суседніх вёсак гэтыя мясціны часам называлі па-іншаму.

**Выгода** – гэта месца, што знаходзіцца на перакрыжаванні дарог Любча – Навагрудак і Загор'е Дзяляціцкае – Нянькава. Раней, за «царскім часам», тут, на «выгадным» месцы, стаяла карчма. Нават і цяпер на перааараным полі на тым месцы часам знаходзяць манеты альбо іншыя рэчы. Недалёка ад яго некалі стаяў хутар бабкі Параскі. У 1950 – 1970-я гг., крыху больш за кіламетр ад вёскі, на перакрыжаванні, быў аўтобусны прыпынак, і ўсе жыхары казалі – «на прыпынку ля Параскі», альбо «на Выгодзе».

**Хотні** – гэта мясцовасць на поўдзень ад вёскі, дзе ворыўная зямля некалі пераміжоўвалася з глыбокімі равамі**,** парослымі арэшнікам і хмызняком. Яна займала вялікі абшар каля вёскі, але там было шмат хутароў і, каб удакладніць назву мясцовасці, казалі – «ля хутара Нягоды», «ля хутара Махно». «Махно» – мянушка печніка дзеда Каратая, які ладна рабіў калісь печы і пліты. Яе ён атрымаў таму, што ў грамадзянскую вайну нібыта ваяваў ва Украіне, у атрадах бацькі Махно. І цяпер у нашай і навакольных вёсках стаяць рускія і галандскія печы, зробленыя рукамі дзеда Каратая.

**Катловішчы** – возера-катлавіна недалёка ад вёскі, дзе летнімі начамі на ўсю моц «спявалі» жабы. Цяпер тут меліярацыйны канал. За ім калісьці стаяў «паўстанцаў хутар» – дом Мікалая Шыкаловіча, дзед якога прымаў удзел у паўстанні 1863 – 1864 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

**Хвойнік** – лясок паміж вёскай і Нёманам. Любчанцы называлі яго Пескі. Лясок быў увесь перарыты траншэямі з бетоннымі «ДОТ»амі часоў Першай сусветнай вайны. Яшчэ захаваўся такі «ДОТ» у агародзе каля Любчанскай царквы, з амбразурай для стральбы ў бок Нёмана. Тры гады тут стаяў фронт, і немцы праклалі чыгуначную вузкакалейку з Наваельні да Любчы. Нават ад Ачукевічаў да Загор'я Дзяляціцкага было адгалінаванне чыгункі для падвозу боепрыпасаў бліжэй да фронту. Склад быў у адным з гумнаў пасярод вёскі. За Нёманам стаяла расійская армія. Перад яе адступленнем амаль палова насельніцтва вёскі была вывезена ў Сібір. Адтуль многія вярнуліся ў 1921 г., перад тым, як заходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад Польшчы, некаторыя засталіся ў Расіі. І яшчэ ў 1950-я гг. пры нарыхтоўцы дроў у месцах, па якіх праходзіла лінія фронту, можна было ў паленах знайсці свінцовыя кулі. Мы, малыя, у засыпаных траншэях знаходзілі некранутыя нямецкія скрыні з гранатамі і снарадамі.

**Пылаўкі** – гэта назва вясковых могілак, якая пацвердзілася зусім нядаўна. У 2011 г., вясной, у засушлівае надвор'е ўсе надмагільныя пліты былі занесены пылам амаль у пяць міліметраў таўшчынёю. З-за пылу, што падняў вецер з палёў, з вёскі цэлы дзень на адлегласці паўтара кіламетра не было відаць і самога ляска на могілках.

**Алешнік** – месца паміж вёскамі Загор'е і Падзагор'е, дзе на забалочаным лузе рос алешнік і цяклі з крыніц дзве рачулкі. Паміж імі стаяла вясковая лазня. На большай рачулцы была бетонная затока з азярцом, у якім мясцовы калгас нават гадаваў карпаў. Вялікі карп даўжынёй каля метра экспанаваўся ў 1958 г. у акварыуме на Любчанскай раённай выставе, каля павільёна Загорскага калгаса імя Дзяржынскага. Цяпер на месцы азярца два зарыбленыя паўгектарныя возёры. А ўздоўж вёскі два ручайкі зліваюцца ў рэчку Перапёлку, якая пад Дзяляцічамі ўпадае ў Нёман.

**Тушава, Балонне, Пярэкалле** – вясковыя выпасы і сенакосы ўздоўж рэчкі Перапёлкі і Нёмана**.**

**Бажніца** – гара па дарозе на вёску Поўбераг. Перад лесам Пасека жыхары навакольных вёсак здабывалі жвір, а зімой з гэтай гары каталася дзятва на прычапных санках-сучках для перавозкі доўгіх бярвенняў. Насупраць гары стаялі чатыры хутары, названыя Селішча.

**Студзянец** – мясцовасць з рачулкай з халоднай крынічнай вадой, што ўпадае ў рэчку Перапёлку, па дарозе на вёску Дзяляцічы. Гэтая рачулка, зусім ручаёк, але на ім за «польскім часам» быў пабудаваны млын Дзінгеля з турбінай замест вадзянога кола, які спалілі ў час Вялікай Айчыннай вайны немцы за тое, што па начах у ім малолі муку для партызан.

**Раманаўкі** – ворыўныя землі паміж вёскай і Войнавам.

**Войнава** – панскі маёнтак з сыраварняй, вялікім садам, каля якога памешчык Наргілевіч больш за сто гадоў таму пабудаваў драўляную царкву – «Падліпку». У царкоўным прыходзе былі вёскі Загор'е Дзяляціцкае, Падзагор'е, Плянта. Там жа, каля царквы, у 1910 г. быў пахаваны сусветна вядомы даследчык Уладзіслаў Дыбоўскі, які меў маёнтак у Нянькаве. Яго сястра была ўладальніцай маёнтка ў Войнаве. Пасля смерці святара ў 1960-я гг. царкву разабралі. Цяпер у былых будынках маёнтка размешчаны сыраварны цэх малочнага камбіната «Навагрудскія дары». На месцы царквы не так даўно пабудавалі капліцу.

У 1970-я гг. 90-гадовы Яўхім Захаравіч Бесараб, старэйшы жыхар Войнава, расказаў легенду пра паходжанне назвы вёскі. У старажытныя часы на яе месцы было ўраджайнае поле, і ў час жніва кожны год рачны цмок выходзіў з Нёмана і зацягваў у ваду самую прыгожую дзяўчыну. Любчанскі пан абвясціў, што калі знойдзецца смелы воін і пераможа цмока, ён аддасць яму ўрадлівыя землі каля Нёмана. Знайшоўся такі воін, перамог рачную пачвару, перасталі знікаць прыгожыя дзяўчаты. З тых часоў стала гэта мясцовасць звацца Войнава.

***Пётр МАКОЎСКІ***




*Від на сенакос Тушава і лес Хвойнік*



*Царква «Падліпка» ў Войнаве*




*Капліца на месцы царквы ў Войнаве*

# Апошняя рака Уладзіміра Караткевіча



Пятро Драчоў. З падарожжа па рацэ Прыпяць з Уладзімірам Караткевічам. 1984 г.



Апошні здымак Уладзіміра Караткевіча, зроблены пад час падарожжа Валянцінам Ждановічам. Ліпень 1984 г.

У сваім маляўнічым нарысе «Зямля пад белымі крыламі» Уладзімір Караткевіч пісаў: *«Рака з непрыгожаю назваю Смердзь ёсць, аднак, адна з найпрыгажэйшых рэчак, якія мне даводзілася бачыць у маім жыцці. Недзе кіламетраў за дзесяць да ўпадзення ў Прыпяць рака пачынае драбіцца на рукавы. Атрымоўваецца некалькі астравоў, злучаных драўлянымі мастамі. На гэтых астравах хаты, што патанаюць у садах. Вада рукавоў цёмна-зялёная, з сонечнымі плямамі, бо над імі вербы ўтвараюць суцэльныя тунэлі. І ў гэтых тунэлях, у імгле, цэлыя чароды чаўноў»*. Так рака Смердзь (ці Смерць, пра яе мы ўжо пісалі на старонках «Краязнаўчай газеты»), вытокі якой у Вялікіх Круговічах, з лёгкай рукі нашага нацыянальнага генія стала яскравым штрыхом да агульнага партрэта краіны.

У Вялікіх Круговічах Уладзімір Караткевіч не бываў і наўрад ці ведаў пра існаванне гэтай вёскі. Але сталася так, што апошнія дні свайго жыцця ён сустрэў на берагах, з такім захапленнем апісанай ім, рачулкі. Рэч у тым, што летам 1984 г. пісьменнік разам з сябрамі мастаком Пятром Драчовым і фатографам Валянцінам Ждановічам рушыў у воднае падарожжа – ад Пінска ўніз па Прыпяці. Пасля смерці жонкі Уладзімір Караткевіч перажываў душэўны крызіс. Сябры спадзяваліся, што такі паход, да таго ж, па любых яму мясцінах, дапаможа акрыяць. Аднак Караткевіч па-ранейшаму моцна маркоціўся, пагоршыўся і яго фізічны стан.

У першую ноч на беразе Прыпяці, калі падарожнікі сядзелі каля вогнішча, над імі пралапатала шырокімі крыламі велічэзная сава, а потым яшчэ і яшчэ – тройчы! Знаўца народных прымхаў Уладзімір Караткевіч, вытрымаўшы паўзу, адзначыў, што гэта знак надзвычай кепскі – ён прадвяшчае смерць. Апошнім для падарожнікаў прыстанкам пазапланава стала якраз тое месца, дзе Смердзь, для класіка «найпрыгажэйшая з рэчак», далучаецца да Прыпяці. Там вырашылі спыніцца на начлег.

22 ліпеня Уладзіміру Сямёнавічу стала зусім кепска. Падарожжа перарвалі. Валянцін Ждановіч павёз яго ў Мінск. 25 ліпеня Караткевіч памёр. Апошні здымак зафіксаваў яго якраз на агульным беразе любімых рэк – Прыпяці і Смердзі.

*Анатоль ТРАФІМЧЫК*

# Альбрэхт – слаўны сын з гнязда Мікалая Фаўстына Радзівіла

*(да 305-годдзя з дня нараджэння)*

Князь Альбрэхт Радзівіл нарадзіўся 25 сакавіка 1717 года ў Дзятлаве. Дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, рэчыцкі староста (1734 – 1773), генерал-маёр войска ВКЛ (з 1755).

Ён прадстаўнік нясвіжскай лініі Радзівілаў герба «Трубы» з сям'і Мікалая Фаўстына Радзівіла і Барбары Завішы, атожылак двух знакамітых родаў, якія з даўніх часоў мелі ўладанні на Дзятлаўшчыне.

Быў другім сынам навагрудскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла. Меў братоў Удальрыка Крыштофа, Ежы і Станіслава. Можна толькі ўявіць сабе, як жылося братам Радзівілам у Дзятлаве ў XVIII стагоддзі. Багаты дом, забавы, заняткі з лепшымі гувернёрамі, прыёмы і балі. І, безумоўна, адказнасць перад сваім родам, імкненне прымножыць славу і гонар продкаў, дасягнуць вышынь на дзяржаўнай службе, пераадолець канкурэнцыю, выгадна ажаніцца, а калі пашанцуе, то і шчасліва. Абавязковае авалоданне вайсковымі навыкамі, каб пры першай небяспецы выставіць войска, сабранае на ўласныя сродкі, і мужна змагацца на ратным полі. Усё гэта было ў жыцці тагачасных магнатаў. І Альбрэхт не падвёў бацьку і братоў, стаў годным сынам радзімы.

Разам з бацькам і братамі Альбрэхт неаднаразова ўдзельнічаў у палітычных інтрыгах. Час быў неспакойны, Рэч Паспалітая трáціла сваю магутнасць, ішла жорсткая палітычная барацьба. Так, у 1733 годзе пасля смерці караля Рэчы Паспалітай Аўгуста Моцнага Альбрэхт з бацькам і братамі выступаў за абранне на польскі пасад саксонскага курфюрста Аўгуста III Веціна, які аказаўся адным з самых слабых каралёў Рэчы Паспалітай. Пры ім неаднаразова зрываліся дзяржаўныя сеймы, панавала анархія.



У 1750 годзе Альбрэхт быў абраны маршалкам Трыбунала ВКЛ. З 1754 года ён – палкоўнік гусарскай харугвы каралевіча Фрыдрыха Крысціяна, старэйшага сына Аўгуста III. У 1763-м, у перыяд бескаралеўя, рэчыцкі староста Альбрэхт Радзівіл быў супернікам партыі Чартарыйскіх, таксама багатага і вельмі ўплывовага магнацкага роду. Выступаў супраць абрання на польскі пасад Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

У 1768 годзе Альбрэхт Радзівіл далучыўся да Барскай канфедэрацыі (вайскова-палітычная арганізацыя, абвешчаная ў мястэчку Бар дзеля абароны незалежнасці Рэчы Паспалітай, накіраваная супраць расійскай агрэсіі і супраць караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага) і быў адным з кандыдатаў на пасаду маршалка канфедэрацыі ў ВКЛ. У 1770-м ён быў абраны маршалкам Барскай канфедэрацыі ў Рэчыцкім павеце. Кіраваў дваром вялікага князя, прымаў замежных паслоў, найвышэйшых урадоўцаў дзяржавы, назіраў за этыкетам, загадваў прыдворнай стражай і каралеўскай гвардыяй, сачыў за бяспекай манарха, прызначаў дваранаў. Фактычна выконваў функцыі сучаснага міністра ўнутраных спраў.

Альбрэхт Радзівіл быў членам Генеральнай рады Барскай канфедэрацыі. Але канфедэраты прайгралі вайну з Расіяй, і Аўстрыя, Прусія і Расія падзялілі Рэч Паспалітую (першы падзел – 1772 год). Аўстрыя і Прусія анексавалі частку земляў Польшчы, Расія – Усходнюю Беларусь і Інфлянты. Перадумовамі падзелу былі поўная палітычная анархія ў Рэчы Паспалітай і няздольнасць магнатаў пераадолець рознагалоссі.

Пасля паражэння Барскай канфедэрацыі ў 1772 годзе Альбрэхт Радзівіл выехаў у Сілезію, а адтуль у Італію. Праз пяць гадоў, у 1777-м, вярнуўся на радзіму і прымірыўся са Станіславам Аўгустам Панятоўскім.

Невядома, адышоў Альбрэхт Радзівіл напрыканцы жыцця ад палітычных спраў ці не, аднак яму пашчасціла не дажыць да моманту знікнення Рэчы Паспалітай з карты Еўропы ў пачатку 1795 года. Тады для многіх магнатаў знікненне дзяржавы стала цяжкім выпрабаваннем годнасці і шляхецкага гонару.

Альбрэхт Радзівіл быў жанаты з Ганнай Кунігундай Халецкай, меў трох дачок – Алаізу, Марыю Аляксандру і Барбару, а таксама сына Дамініка.

*Алена АБРАМЧЫК,*
*г. Дзятлава*

*Сямейная рэліквія*

# Скрыня бабулі Зосі

Я нарадзілася і жыла ў вёсцы Радкава, што на Салігоршчыне. З самага маленства пазнаёмілася з сялянскай працай і бытам: з таткам Віцем ганяла кароўку Рыжму «на прыпас», каб яна травы маладой пад'ела, навучылася яе даіць у 8 гадкоў, рвала зелле свінкам, карміла курэй і куранятак, пасвіла на выгане гусей і г.д. Але болей за ўсё я любіла прыбіраць родную хату. Яна была вялікая, ажно тры пакоі, таму і працы было шмат. Я брала ў свае дзіцячыя ручкі вялікі бабулін венік і спрытна вымятала драўляную падлогу, смела залазіўшы пад самаробныя ложкі. Затым мяла падлогі ў вялікіх сенцах і ў кладоўцы, дзе таямніча пахла жытам і мукой, што былі насыпаны ў высокія дубовыя бочкі. Потым анучкай спрытна выцірала мэблю і вокны. Чамусьці асабліва любіла выціраць ад пылу бочкі з мукой. Я здымала вялікую самаробную накрыўку і з асалодай удыхала водар мукі. А водар быў непараўнальны, бо зерне расло на роднай ніве, а малолі на сапраўдным млыне ў вёсцы Балотчычы, гэта за 15 кіламетраў ад маёй роднай вёскі.

Але кульмінацыяй «прыбораў», як казала бабуля Зося, была адна чароўная дзея. Бабуля адчыняла сваю вялікую, пафарбаваную ў чырвоны колер скрыню, і дазваляла мне «наводзіць там парадкі». І я з задаальненнем даставала з той цудоўнай скрыні бабуліны строі: святочныя спадніцы, сукенкі і блузкі. А больш за ўсё любіла даставаць, разгортваць і прыкладваць да сябе бабуліну святочную бялізну і пашытую з тонкага саматканага палатна сарочку. Яна была бялюсенькай, бо тое палатно выбельвалі блехам, мела дзве тоненькія тасёмачкі, «шлеечкі», як казала бабуля. А яшчэ па нізе і на грудзях была аздоблена самаробнымі каруначкамі, што рабіла бабуля шыдэлкам. У нашай сям'і тыя каруначкі велічна называлі на шляхечы манер «гарунаачкі», бо сям'я лічылася са шляхты. А потым мы разам з бабуляй вымалі з той скрыні святочныя посцілкі і настольнікі. Усё гэта было саматканым і таксама аздоблена самаробнымі гарунаачкамі найпрыгажэйшых колераў. Усё, што вымалі, мы раскладвалі на вялікую дубовую лаву, што зрабіў яшчэ ў 1930-я гады дзядуля Ігнат, на стулы, на спінкі ложкаў. «Каб не адсырвала!» – так казала бабуля Зося. І насілася я ад адной прыгожай рэчы да другой, пяшчотна гладзіўшы іх. Але вось прыгожую сарочку раз за разам прыкладвала да сябе і бегла да



*Бабуля Зося з праўнукамі Наташкай і Алёшкам*

вялікага насценнага люстэрка, каб пакруціцца ў ім.

Па баках вялікай скрыні былі прыбіты невялікія скрыначкі, гэткі самаробны, як цяпер сказаць, сейф, дзе ляжалі бабуліны пацеркі, завушніцы і розныя важныя паперы. І мне дазвалялася ўсё гэта перагледзець і перачытаць, бо чытала я з пяці гадкоў, татка навучыў. Ад папер прыемна пахла нечым таямнічым і дзіўным, а пацеркі дазваляла бабуля і на шыйку надзець.

Праз пэўны час бабуля пачынала складваць усе гэтыя каштоўнасці ў скрыню, я ёй дапамагала, а калі зачынялася века, то ўздыхала з жалем. А бабуля засмяецца ды скажа: «Не хвалюйся, Валька, хутка зноў будзем прыбіраць у хаце і ў скрыні перабяром!» І я радасна бегла на агарод, каб нарваць зелля парасяткам, а потым насыпаць зерня курачкам...

Калі ў мяне ўжо была свая сям'я, то і маім дзеткам, Алёшку і Наташцы, пашчасціла неаднойчы зазірнуць у скрыню прабабулі Зосі, убачыць тыя прыгожыя посцілкі, настольнікі, і нават бабуліну беленькую сарочку з танюткімі тасёмачкамі і найпрыгажэйшымі гарунаачкамі.

*Валянціна БАБКО-АЛЯШКЕВІЧ*

# Уводзіны ў духоўны свет

Каб запаведзі Божыя прынеслі нам карысць, неабходна іх зрабіць сваімі, і дапамагаюць нам у гэтым кнігі. Духоўная літаратура закліканая не толькі паўплываць на розум і пашырыць кругагляд чытача, не толькі звярнуць яго ўвагу на адхіленыя ад паўсядзённага жыцця пытанні, але перш за ўсё, увесці таго, хто чытае, у свет вечнай ісціны і прыгажосці. Дварэцкая сельская бібліятэка сямейнага чытання ўжо каторы год працуе па бібліятэчнай мэтавай праграме «На шляху да духоўнасці». У яе рамках штогод ладзіцца Дзень праваслаўнай кнігі, сустрэчы са святарамі.



Сёлета Дзень праваслаўнай кнігі прайшоў пад назвай «Живое слово мудрости духовной». Настаяцель храма Прасвятой Багародзіцы айцец Сергій расказаў прысутным аб шматвяковай гісторыі праваслаўя на беларускай зямлі, падарыў бібліятэцы праваслаўныя кнігі пра Жыровіцкую цудадзейную ікону Божай Маці, Жыровіцкі Успенскі манастыр і іншыя. Бібліятэкар расказала пра галоўныя праваслаўныя кнігі, пазнаёміла з творчасцю пісьменнікаў, чые імёны ўпісаны залатымі літарамі не толькі ў гісторыю сусветнай літаратуры, але і ў гісторыю Праваслаўнай Царквы. Да 1030-годдзя з часу заснавання Беларускай Праваслаўнай Царквы была афармлена кніжная выстава, дзе размешчаны кнігі аб Хрышчэнні Русі, выданні, што расказваюць пра беларускіх святых, знаёмяць з шанаванымі іконамі, галоўнымі хрысціянскімі святамі. Праведзеным мерапрыемствам бібліятэкар імкнулася паказаць прыгажосць духоўнага жыцця праз кнігі. Няхай кожны наведвальнік знойдзе веру і цікавасць да духоўнага жыцця.

А 14 сакавіка ў Дварэцкай сельскай бібліятэцы сямейнага чытання сумесна з Раготнаўскай сельскай бібліятэкай-клубам прайшла сустрэча «Духоўная кніга – крыніца вялікай мудрасці», на якой бібліятэкары расказалі прысутным пра асветнікаў, прапаведнікаў хрысціянства Кірылу і Мефодзія. З задавальненнем дзеці паўдзельнічалі ў конкурсе прыказак пра кнігу, паглядзелі сцэнку, якая вучыць берагчы яе. Айцец Сергій пазнаёміў дзяцей з галоўнай кнігай – Бібліяй. На заканчэнне бібліятэкары прапанавалі праваслаўны мультфільм «Гэта мой выбар».

*Алена КАЗЛОВА,*
*бібліятэкар Дварэцкай сельскай бібліятэкі,*
*Дзятлаўскі раён*

*Дзе варта пабываць*

## «Ferrum Bellum. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя»




***Выстава пад такой назвай працуе ў Мінскай гарадской ратушы. Гэты праект не столькі пра зброю і рыцарскія даспехі, колькі пра любоў да гісторыі і яе ўвасабленне. Ён дазваляе дэталёва разгледзець узбраенне розных часоў і пазнаёміцца з беларускім кавальствам.***

Важныя штрыхі экспазіцыі – дакладна рэканструяваныя макеты ўзбраення, якія дапамогуць прасачыць за развіццём еўрапейскай ваеннай справы ў перыяд з XIV і да канца XVII стагоддзя. Усе даспехі, прадстаўленыя на выставе, выраблены па гістарычных узорах і здольны ажыццяўляць сваю галоўную функцыю – абараняць уладальніка. Наведвальнікі могуць убачыць эвалюцыю рыштунку ад простых пласцінчатых да высокатэхналагічных суцэльнаметалічных даспехаў. На выставе прадстаўлены розныя элементы ўзбраення рыцара і яго рыштунку: мячы, баявыя сякеры, кінжалы, шчыты, а таксама характэрныя для тэрыторыі Беларусі корды, шлемы бацынеты, кальчугі, кірасы і інш.

Выставачны праект дэманструе таксама працэс вырабу ўсіх прадметаў. Каб дакладна рэканструяваць любую эпоху, трэба спачатку асвоіць актуальную для яе тэхналогію. Кавадла, мяхі, кавальскі горан, абцугі, долата, молаты ў межах выставы аб'яднаны ў стылізаванай «кавальскай майстэрні». Гэтыя інструменты выраблены па аўтэнтычных крыніцах розных эпох, узнаўляюць эвалюцыю кавальскага рамяства на беларускіх землях, ад самых простых спосабаў арганізацыі беларускай кавальскай справы да з'яўлення на тэрыторыі краіны цэхавых аб'яднанняў.

Частка даспехаў-экспанатаў была выраблена менавіта пры дапамозе адзначаных вышэй інструментаў. Экспанаты, прадстаўленыя на выставе, створаны рэканструктарам Юрыем Усціновічам і кавалём Дзмітрыем Андрэевым. Выстава працуе да 15 чэрвеня.

*Паводле інфармацыі арганізатараў*

# «Мой родны кут Жупранская старонка»



Мястэчка Жупраны ў Ашмянскім раёне, здаецца, не вызначаецца нічым прыкметным. Але гэта толькі на першы погляд.

Жупраны вядомы ўжо з 1407 года, калі князь Вітаўт падараваў вёску віленскаму ваяводу Войцеху Монвіду. Потым амаль 300 гадоў яна знаходзілася ў руках Радзівілаў, а напрыканцы XVIII стагоддзя з'яўлялася цэнтрам Жупранскага графства. Шмат падзей давялося перажыць мясцовым жыхарам, але дзякуючы таму, што яны плячо ў плячо стаялі побач пры любых выпрабаваннях, шанавалі свае помнікі і традыцыі, кожны раз аднаўлялі мірнае жыццё вёскі.

Сёння Жупраны – гэта квітнеючы аграгарадок са сваёй амбулаторыяй, аптэкай, аддзяленнем сувязі, бібліятэкай, магазінамі, дзіцячым садком і сярэдняй школай. Асаблівую цікавасць ён мае для турыстаў з-за прыгожага касцёла Св. Пятра і Паўла ў неагатычным стылі і магілы вядомага беларускага пісьменніка Францішка Багушэвіча.

Сёлета Жупранам спаўняецца 615 гадоў. З гэтай нагоды мясцовая сельская бібліятэка прадстаўляе краязнаўчы праект «Мой родны край Жупранская старонка». Фарміраванне зацікаўленасці чытачоў, асабліва дзяцей і моладзі, да помнікаў даўніны, гераічнага мінулага краю, да прыроды навакольных мясцін, задавальненне патрэб у жаданні пазнаць новае, раскрыць нязведаныя старонкі – вось галоўныя накірункі гэтага праекта, над якім бібліятэкар будзе рупліва працаваць увесь год.

*Галіна РАБЦЭВІЧ,*
*бібліятэкар Жупранскай сельскай бібліятэкі,*
*Ашмянскі раён*

# Новы танцавальны маршрут

***Люты 2022 года сапраўды выдаўся лютым. З розных прычын. Хто ўбачыць гэта ў свежым нумары, зразумее гэта адным чынам, хто возьмецца за артыкул праз колькі гадоў, калі будзе вывучаць гісторыю станаўлення танцавальнага руху ў Беларусі, спадзяюся, убачыць толькі паведамленне пра танцы.***

***А танцы былі, і былі надзіва экстрымальнымі. У якім сэнсе? У тым, што шмат у чым яны маглі быць азначаныя словам «гранічна», што вельмі б набліжала кожную характарыстыку да самай памежнай яе кропкі.***



І самае першае такое «памежжа» – гэта новае месца, што знаходзіцца амаль каля МКАД – корпус № 2 Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь». Менавіта тут 23 лютага адчыніліся дзверы для новай імпрэзы. Новая яна была больш для саміх арганізатараў – фальклорных гуртоў «Мілавіца» і «Скарбніца традыцый», якія базуюцца на «Ветразі». Але ні новыя гаспадары, ні далечыня ад цэнтра танцораў не перапыніла і не засмуціла, бо вопыт паказвае, што па скокі яны могуць ехаць не толькі ў другі раён горада, але і ў іншыя вобласці! Таму ў залі па выніку ўсё адно было людна, што не магло не радаваць дзяўчат са згаданых гуртоў, якія меліся быць гаспадынямі танцавальнай прасторы. Сама ж вечарына была прысвечана Дню роднай мовы. І хоць адбывалася яна праз два дні пасля афіцыйнага свята, гэта не зашкодзіла Надзеі Касцяневіч – адной з арганізатарак – нагадаць, як важна ў наш час клапаціцца аб беларускай мове і несці яе людзям пры любой магчымасці. У танцы, канечне, гавораць хіба што мовай рухаў, але беларускія пабытавыя танцы – таксама важны носьбіт беларускага культурнага кода. І каб пашырыць яго сярод гасцей, вечарына сталася своеасаблівым майстар-класам па старых, новых ці добра забытых танцах. Так, напрыклад, Ірына Хамутова навучала танцораў скокам з аграгарадка Хаціслаў Маларыцкага раёна.



Другое «памежжа» – вялікая абмежаванасць па часе. Першапачатковыя дзве гадзіны праз розныя знешнія фактары былі ўрэзаныя ледзь не да паўтары! Што, безумоўна, для некаторых, звыклых танчыць і ўсю ноч, было занадта мала. Але гэта былі насычаныя паўтары гадзіны!

І тут ужо пойдзе размова пра трэці «экстрым», а менавіта – што ж паспелі. А можаце даваць веры, а можаце і не, нейкім чынам за гэты час госці паспелі станчыць амаль усе вядомыя формы танцаў (толькі што, можа, індывідуальных ці варыянтаў праз кійкі, кшталту «Мікіты» ці «Зайца», не было).

Акрамя звыклых ужо парных формаў, напрыклад, «Суботы» ці «Грачанікаў», гасцей запрасілі далучыцца і да «Гапака» ў тройках з Кобрынскага раёна, «Церніцы» ў чацвёрках з вёскі Хаціслаў Маларыцкага раёна (нагадаю, што госці змаглі вывучыць даволі шмат танцаў з гэтай мясцовасці, запісаных пад час экспедыцыі ў гэты рэгіён). Не прамінем і тое, што зноў адбылася спроба аднавіць кадрылі на вечарынах. Гэтым разам гасцям прапанавалі развучыць «па-працоўнаму» «Кадрыльную Лявоніху» з Краснапольскага раёна.

Але ж і варта адзначыць, што пачыналі і скончылі вялізнай і шматлюднай «Полькай» з камандамі. А паколькі, як і было прадугледжана, на пачатку шмат хто з гасцей мог не зарыентавацца ў тым, што адбываецца на танцполе, цягам вечарыны гаспадыні навучалі іх розным камандам, якія часцей за ўсё можна пачуць. Паказвалі, замацоўвалі. Такім чынам, гэты танец прайшоў лейтматывам праз усю вечарыну. І ёсць спадзеў, што такая форма яшчэ будзе з'яўляцца на розных танцавальных вечарынах.

***Госці разыходзіліся натанцаваныя і задаволеныя, плануючы яшчэ якія актыўнасці на будучыню. Спадзяемся, што ім атрымаецца спраўдзіцца. Рана ці позна, разнявolена і без згрызотаў сумлення.***

*Дар'я НЕСЦЯРЭНКА*

## Красавік

**1 – Багдановіч Адам (Адольф) Ягоравіч** (01 ці 06.04.1862, Крупскі р-н – 1940), этнограф, фалькларыст, моваязнаўца, гісторык культуры, мемуарыст – 160 гадоў з дня нараджэння.

**1 – Алесь Жук (Аляксандр Аляксандравіч**; 1947, Слуцкі р-н), пісьменнік, перакладчык, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978), Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1982) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1992) – 75 гадоў з дня нараджэння.

**4 – Якубоўскі Якуб (Якаў Адамавіч**; 1932, Пастаўскі р-н – 1998), вучоны-гісторык, географ, аўтар гімна беларускіх татар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**7 – Славук (Слаук) Валерый Пятровіч** (1947, Талачынскі р-н), графік, ілюстратар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1993), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2017) – 75 гадоў з дня нараджэння.

**9 – Бойка Уладзімір Андрэевіч** (1932, Мінск – 1996), мастацтвазнаўца, мастак, літаратурны крытык, паэт, публіцыст, журналіст – 90 гадоў з дня нараджэння.

***Уздоўж***

**1**. – Эх, жыццё! Раней вавёрцы ў … пападаў, а зараз толькі жонцы ў вуха (жарт). **5**. Бацька за парог, а дзеці за … (прык.). **8**. «Смех, смяхоцце, …. // Выйшла кошка за ката». З верша Л. Пранчака «Смехата». **9**. Удача. **11**. «О, вясна! О, вясна – …! // Ты прыйшла! Ты з'явілася зноў!». З верша Т. Дзям'янавай «О, вясна!» **12**. Шчасце прыходзіць у …, дзе смяюцца (прык.). **14**. Сатырычнае адлюстраванне каго-, чаго-небудзь. **15**. … папуасу сябра, таварыш і корм (жарт). **16**. Прыйшло шчасце, хоць у … звані (прык.). **20**. Кароткае паведамленне. **21**. … – сяброўка, а жарт – сястра (прык.). **22**. Старыя … прыехалі ў госці (прык.). **23**. Машына для скручвання чайнага ліста. **25**. Грашовая адзінка Бразіліі. **26**. «Адзначаюць свята смеху, // Ну і …! Вось …!» Цытата невядомага аўтара. **29**. Месца спуску (разм.). **30**. Расліна з прыемным вострым пахам. **32**. «Смех без прычыны – прыкмета таго, што вы або ідыёт, або прыгожанькая …». Цытата невядомага аўтара. **34**. Хітры, як ліса, а баязлівы, як … (прык.). **35**. Воўк не пастух, а казёл не агароднік: воўк злодзей, а казёл – … (прык.). **36**. «І ха-ха-ха! Зарагаталі. // – А каб вы, падлы, не дадждалі! – // Гаворыць дзядзька, сам смяецца, // Аж … з клецкамі трасецца». З паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». **37**. Сораму, як у пеўня … на шпорах (прык.).



***Упоперак***

**2**. Пень, вывернуты з карэннем. **3**. Мохавае балота. **4**. Качка ды рыбка – божая … (прык.). **5**. Ідзе, быццам … плыве (прык.). **6**. Мілагучнасць. **7**. … сонцам веснім ззяе, // І ўсіх вакол сябе яднае (прык.). **10**. З'едлівасць (перан.). **13**. Першацвет. **17**. Вясёлая жанчына. **18**. Злы чалавек спіць … (прык.). **19**. Паляванне – гэта …! Асабліва калі патроны кончыліся, а кабан яшчэ жывы (жарт). **22**. Народнае гулянне. **24**. Нясіце … людзям, а шчасце следам прыбяжыць (прык.). **27**. Прыстасаванне для дасушвання снапоў, травы. **28**. Тое, што і песіміст, ныцік. **31**. Старажытнаегіпецкі бог Сонца. **32**. Танцуе не цела, танцуе … (прык.). **33**. Частка свету.

*Склаў Лявон ЦЕЛЕШ*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**РАЗЬБА́ ПА ДРЭ́ВЕ** *(працяг артыкула)*. Пад уплывам мастацтва Старажытнай Русі пінскім разьбяром Ананіем створаны двухбаковы абраз «Премудрость созда себе храм. Праздники» (1499 – 1525). Пазнагатычныя традыцыі бачны ў скульптурах св. Марыі і св. Іаана Багаслова з в. Мсцібава Ваўкавыскага раёна (XVI ст.), св. Ганны і св. Іаакіма з в. Здзітава Бярозаўскага раёна (канец XVI ст.). У Варанілавіцкіх царскіх варотах рысы рэнесансу спалучаны з старажытнарускімі і мясцовымі традыцыямі. Мастацкія прынцыпы Адраджэння найбольш яскрава выявіліся ў скульптурах «Кацярына Александрыйская», «Лізавета Венгерская», «Казімір» з Шарашова, кампазіцыі «Марыя з дзіцем» з Нясвіжа (усе – канец XVI ст.), у спалучэнні з рысамі барока – у Віцебскіх царскіх варотах, рэльефнай разьбе на дзвярах касцёла кармелітаў у Глыбокім (XVII ст.) і Георгіеўскага касцёла ў в. Краманіца Дольная Зэльвенскага раёна (1617 – 1657). У некаторых творах прыкметны ўплыў маньерызму (св. Марыя, св. Іаан Багаслоў з дамініканскага касцёла ў Навагрудку, 1617 – 1637).



*Бакавы алтар касцёла Іаана Хрысціцеля ў Воўпе*



*Галоўны алтар Гродзенскага касцёла езуітаў*

Прастатой і выразнасцю сілуэта, рацыяналістычнасцю зместу, імкненнем да перадачы характару персанажа, фактуры матэрыялаў, любоўю да арнаментыкі і дэкору, блізкімі да натуры прапорцыямі вылучаюцца помнікі стылю барока: св. Станіслаў і «Іосіф з дзіцем» з касцёла в. Гнезна Ваўкавыскага раёна (1-я палова XVII ст.), св. Давыд, св. Рох, св. Дамінік, св. Себасцьян з дамініканскага касцёла ў Навагрудку (1617 – 1637), скульптура галоўнага алтара Гродзенскага касцёла езуітаў (XVIII ст.). Характэрным для барока сінтэзам мастацтваў вылучаюцца алтары Будслаўскага касцёла бернардзінцаў, Воўпаўскага касцёла Іаана Хрысціцеля, касцёла ў в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна (XVIII ст.), царквы ў в. Порплішча Докшыцкага раёна (сярэдзіна XVII ст.).

***(Заканчэнне артыкула ў наступным нумары)***

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасная – 633202

**Галоўны рэдактар – Максім Навумавіч ГАЛЬПЯРОВІЧ.**
**Адказны сакратар Алесь Сачанка.**
**Рэдкалегія:** Уладзімір Гілеп (старшыня), Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Радзім Гарэцкі, Ганна Запартыка, Павел Каралёў, Алесь Карлюкевіч, Аляксандра Кравец, Ігар Пракаповіч, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі, Аляксандр Суша.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 23.03.2022
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 101.
Тыраж 417 асобнікаў.